**Бяляўская, Н.** Два гады без цішыні / Н. Бяляўская // Родныя вытокі. — 2011. — 12 лют. — С. 1.

# ДВА ГАДЫ БЕЗ ЦІШЫНІ



***Кожны люты, бліжэй да даты вываду савецкіх войск з Афганістана, ён зноў садзіцца ў самалёт і разам з групай маладых салдат накіроўваецца на вайну... Затым трапляе ў абстрэл... Сам страляе... Ірвуцца машыны на мінах... Вушы закладае свіст куляў, роў матораў, шум...***

Вось ужо 22 гады мінула пасля таго, як быў дэмабілізаваны Андрэй Ткачэнка. І здаецца, што далёка ў мінулым засталіся тыя часы, а надыходзіць перыяд доўгачаканага свята для воінаў-інтэрнацыяналістаў, і зноў у памяці ўзнікаюць падзеі, сны становяцца трывожнымі, хвалюючымі. «Іншы раз спаць класціся не хочацца, – гаварыць мой субяседнік. – А расплюшчваеш вочы, адчуваеш халодны пот на спіне, а затым усміхаешся, бо ўсё ж добра. Вось за акном віднеецца. Вось спакойна спіць побач жонка. А ў суседнім пакоі пасопвае сваім маленькім носікам трохмесячная ўнучка». Так, зараз у Андрэя Уладзіміравіча ўсё адладжана. Дом, які выдзеліла дзяржава за ўдзел у інтэрнацыянальнай вайне, вялікі, прасторны. Некалі ў ім хапала месца траім дачушкам, і зараз, калі адна пасля замужжа пакінула бацькоўскае гняздо, у доме членаў сям´і не зменшылася: з’явіўся муж другой дачкі, і маладая сям’я разам з немаўляткам утульна размясцілася разам з бацькамі. Андрэй Уладзіміравіч вельмі задаволены тым, што ёсць унукі, што двухгадовы ўнучак цягне да дзядулі ручкі і называе яго сваім прыдуманым імем, што падрастае кроха-дзяўчынка. У планах – вывучыць, даць адукацыю сярэдняй, паглядзець, як складзецца жыццё ва ўсіх траіх. Вучыў і працаваць іх, і адказваць за свае дзеі, і быць добрымі, спагадлівымі, мець гонар, годнасць. У тым, што сам трапіў на вайну, галоўным быў не прыказ, а ўласнае рашэнне. Больш правільней сказаць, сумленне. «Які гэта хлопец, калі ў арміі не служыў? – разважаў я, так лічылі і многія другія хлопцы. – Ды дзяўчаты будуць думаць, што хворыя, што замуж за мяне ісці нельга. Трэба служыць абавязкова. Афганістан? Канечне, разам з усімі. Бог дасць, не заб'юць. А калі заб'юць – значыць рок, лёс, так трэба...» Праўда, вельмі не хацелася паміраць ні першыя 6 месяцаў на пачатку службы, ні апошнія – напрыканцы. Год паміж імі быў прывычнай, звычайнай

з'явай. Выбухі, стрэлы, шумы... Да іх так прызвычаіліся, што першыя хвіліны, калі высадзіліся ў Фергане перад адпраўкай дамоў, то амаль аглох… ад цішыні. Тады так выяўна пачуў, як стракочуць цвыркуны, што ажно спужаўся. Мір, спакой... А ў вачах адзін з апошніх абстрэлаў. Калона машын, якая перавозіла груз, а служыў Ткачэнка вадзіцелем у асобным батальёне сувязі радыётэхнічнага забеспячэння, ішла з Кабула, насустрач ёй – калона машын з гаручым матэрыялам. Вось тую калону і пільнавалі душманы. Пачаўся абстрэл у разбураным кішлаку. Гадзіну вялася перастрэлка, пакуль не прыляцелі два звяны верталётаў і не сыпанулі нурсаў. Канечне, як можна было справіцца нашым салдацікам без паветранай абароны, калі тыя сядзелі за шчыльнымі платамі, якія злеплены з гліны, і, адкуль стралялі, цяжка было ўгадаць.

Афганскае братэрства... Яно наймацнейшае за ўсё. 71 былы «шураві» ведае адзін другога добра. Знаёмыя сем'ямі, у курсе ўсіх спраў, у стане дапамагчы адзін другому, радуюцца за кожнае дасягненне і заўсёды побач у патрэбную хвіліну. Яны не разыходзяцца пры сустрэчы без цёплых слоў, яны ганарацца сяброўскай узнагародзе, як сваёй. Ордэны Чырвонай зоркі – баявыя ўзнагароды, якіх удастоены Валянцін Андрыеўскі і Васіль Лібоза за здзейснены асабісты подзвіг, успрымаюцца як агульная ўзнагарода за мужнасць, стойкасць, вытрымку на вайне ў Афганістане, а не толькі подзвіг асобнага чалавека. Так лічыць Андрэй Ткачэнка. З ім цяжка не пагадзіцца.

**Н. Бяляўская**